Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ"
_______________Н.У.Карчэўская
"_9_" _________________2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД _37_ / эвуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ Ў МУЗЫЧНЫМ УВАСАБЛЕННІ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)*
*1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)*

2018

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі вышэйшай адукацыі I ступені і вучэбнымі планамі ўстановы адукацыі па спецыяльнасцях “Мастацтва эстрады (па напрамках), “Народная творчасць (па напрамках)”

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*В. С. Варапаева,* прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В. А. Грачова,* дацэнт кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

*Ф. В. Драбеня,* намеснік дэкана факультэта журналістыкі ўстановы адукацыі “Інстытут журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта” кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 15.05.2017);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 28.06.2017)

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Асноўнай мэтай вучэбнай дысцыпліны "Беларуская паэзія ў музычным увасабленні" з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў разумення "першаснасці слова" і яго рэалізацыя ва ўсіх відах мастацтва, у прыватнасці ў песеннай творчасці. Змест вучэбнай дысцыпліны накіраваны на азнаямленне студэнтаў (будучых прафесіяналаў у сферы музычнага мастацтва Беларусі) са спецыфікай вершаванага слова, яго адметнасцю, арыгінальнасцю паэтычных вобразаў. Праз музычнае ўвасабленне студэнты павінны азнаёміцца з творамі выбітных беларускіх паэтаў, творы якіх сталі крыніцай натхнення для кампазітараў. Вучэбная дысцыпліна будзе спрыяць фарміраванню моўна-эстэтычнага густу, а таксама выхаванню музычнай культуры, павагі да нацыянальнай музычнай спадчыны, комплекснаму асэнсаванню мастацкай вартасці песеннай паэзіі.

Змест вучэбнай дысцыпліны "Беларуская паэзія ў музычным увасабленні" вызначаецца яго задачамі:

– асэнсаваць паняцці "інтэрпрэтацыя", "узаемадзеянне" відаў мастацтва (верш-музыка-спявак);

– выпрацаваць разуменне ролі асобы (паэт – кампазітар – спявак) у інтэрпрэтацыі літаратурнага твора;

– актывізаваць творчае ўяўленне, крэатыўнасць у рэалізацыі пэўнай задумы кампазітара.

Студэнты павінны *ведаць:*

– песенную спадчыну беларускіх паэтаў (класікаў і сучасных);

– спецыфіку інтэрпрэтацыі вершаваных твораў вядомымі беларускімі кампазітарамі.

Студэнты павінны *ўмець:*

– крэатыўна падыходзіць да адбору і інтэрпрэтацыі твораў з пункту гледжання іх актуальнасці, змястоўнасці і эстэтычнай вартасці;

– выпрацоўваць уласны погляд на рэалізацыю песеннай спадчыны беларускіх паэтаў у практычнай дзейнасці.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый, адпаведна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках):

*акадэмічныя кампетэнцыі:*

– АК-2. Валодць сістэмным і параўнальным аналізам.

– АК-4. Умець працаваць самастойна;

*прафесійных кампетэнцый:*

ПК-19. Планаваць і ажыццяўляць адміністацыйна-арганізацыйную дзейнасць арганізацыі (асобнага праекту) выканальніцкіх мастацтваў.

ПК-20. Ажыццяўляць неабходныя маркетангавая дзеянні для складання прагнозу эфектыўнасці арганізацыі (праекту), знаходзіць неабходныя фінансавыя сродкі для яго рэалізацыі.

ПК-23. Ужываць новыя інавацыйныя тэхналогіі навучання,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі.

ПК-25. Займацца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне тэорыі і гісторыі мастацтва эстрады.

ПК-26. Ведаць прынцыпы, прыёмы збірання, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі і правядзення навуковых даследаванняў у сферы мастацтва эстрады.

ПК-27. Рыхтаваць даклады, матэрыялы, аналізаваць і ацэньваць сабраныя звесткі для навуковых даследаванняў.

ПК-28. Карыстацца сучаснымі інфармацыйнымі рэсурсамі.

Зместам вучэбнай дысцыпліны прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый, адпаведна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці *1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)*:

*прафесійныя кампетэнцыі:*

ПК-3. Забяспечваць шматбаковыя сувязі з грамадскасцю ў працэсе работы, удзельнічаць у распрацоўцы рэкламнай і друкаванай прадукцыі.

ПК-4. Рыхтаваць даклады, паведамленні і іншую дакументацыю ў галіне народнай творчасці і ўдзельнічаць у іх рэпрэзентацыі.

ПК-14. Аналізаваць перспектывы і напрамкі захавання і развіцця народнай творчасці.

ПК-17. На навуковай аснове арганізоўваць сваю творчую прафесійную дзейнасць, валодаць найноўшымі навуковымі распрацоўкамі, а таксама сучаснай інфармацыяй у сферы мастацкай культуры.

ПК-18. Ажыццяўляць нагляд за бытаваннем розных відаў і жанраў народнай творчасці ў мэтах іх аховы і пераемнасці.

ПК-19. Ведаць прынцыпы і прыёмы збірання, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі для правядзення навуковых даследванняў у галіне народнай творчасці.

ПК-23. Планаваць рэпертуар уласных мастацкіх (музычных) твораў.

ПК-24. Працаваць з крыніцамі рэпертуару, літаратурай па народнай творчасці.

ПК-25. Арганізоўваць этапы працэсу выканання мастацкіх (музычных) твораў для эстэтычнага выхавання і фарміравання высокамастацкіх густаў насельніцтва.

ПК-26. Выступаць у якасці акцёра-выканаўцы ў прафесійных і аматарскіх музычных калектывах, драматычных тэатрах, музычных тэатрах, тэатрах-студыях, на радыё, тэлебачанні, у канцэртных установах.

Спецыяліст па напрамкам спецыяльнасці 1-18 01 01-01 “Народная творчасць (харавая музыка)”, 1-18 01 01-02 “Народная творчасць (інструментальная музыка)” акрамя таго, павінен быць здольным:

*Творчая дзейнасць:*

ПК-27. Рабіць уласныя аранжыроўкі, інструментоўкі, апрацоўкі і пераклады для харавых калектываў, аркестраў, ансамблей.

ПК-28. Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-29. Рыхтаваць творчыя выступленні харавых (інструментальных) калектываў і весці канцэртную работу ў рэгіёне і па-за яго межамі.

Вучэбная дысцыпліна “Беларуская паэзія ў музычным увасабленні” цесна звязана з вучэбнай дысцыплінай “Беларуская і сусветная літаратура: Беларуская літаратура”.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская паэзія ў музычным увасабленні” ўсяго прадугледжана 54 гадзіны, з якіх 8 – аўдыторныя гадзіны. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 6 гадзін – лекцыі, 2 гадзіны – семінарскія заняткі. Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Тэма 1. Уводзіны

Прадмет і задачы вучэбнай дысцыпліны "Беларуская паэзія ў музычным увасабленні". Мастацкі твор як феномен чалавечай думкі і вобразна-выяўленчага мыслення. Роля вобразнага слова ў стварэнні музычнага твора.

### Тэма 2. Беларуская класічная вершаваная (песенная) спадчына

Асаблівасці мастацкага стылю, паэтычнага падстылю. Адметнасць вобразаў і вобразна-выяўленчых сродкаў вершаванай мовы. Супастаўляльная характарыстыка мовы верша і мовы песні. Спалучэнне слова і музыкі. Паэтычныя ідыястылі М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа.

Песенная спадчына М. Багдановіча і яе рэалізацыя ў беларускім музычным мастацтве (вершы – кампазітары – выканаўцы).

Тэмы і вобразы песеннай спадчыны Я. Купалы і яе ўвасабленне ў беларускім музычным мастацтве (вершы – кампазітары – выканаўцы).

Якуб Колас і яго вершы-песні (вершы – кампазітары – выканаўцы).

### Тэма 3. Сучасныя беларускія паэты-пееннікі і іх творчасць

Паэтычныя ідыястылі Н. Гілевіча, Г. Бураўкіна, Р. Барадуліна, У. Караткевіча, Л. Дранько-Майсюка, Р. Баравіковай і інш.

Суаднесенасць мастацкага слова і музыкі. Тэмы і вобразы вершаў-песень Н. Гілевіча і іх сцэнічны лёс.

Песенная спадчына Г. Бураўкіна. Кампазітары і выканаўцы.

Роля бардаў у распаўсюджванні вершаў-песень У. Караткевіча. Спалучэнне слова і музыкі.

Песні на словы Л. Дранько-Майсюка, Р. Баравіковай, Я. Янішчыц і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны

*для студэнтаў завочнай формы навучання*

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | | лекц. | сем. | |
| 1. | Уводзіны | 2 | | |
| 2. | Беларуская класічная вершаваная (песенная) спадчына | 2 | | чытацкія дзённікі |
| 3. | Сучасныя беларускія паэты-песеннікі і іх творчасць | 2 | 2 | прэзентацыя |
| | Усяго | 6 | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА
## Літаратура

### *Асноўная*


1. Багамолава, А. М. Стылістыка і культура беларускага маўлення: вучэб. дапам. / А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова. – Мн.: Выд-ва Граўцова, 2012. – 304 с.
2. Басава, Г. І. Святло слова / Г. І. Басава, В. І. Іўчанка, Л. Д. Сінькова. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2002. – 144 с.
3. Вітаю цябе, Натхненне!: матэрыялы па стылістыцы і культуры маўлення / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; уклад.: А. Багамолава [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2015. – 138 с.
4. Ляці вышэй!: матэрыялы па лінгвістычным аналізе мастацкага тэксту / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; уклад.: А. Багамолава [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2014. – 117 с.
5. Пісарэнка, А. М. Філалагічны аналіз мастацкага тэксту: вучэб. дапам. / А. М. Пісарэнка. – Мінск: Народная асвета, 2017. – 175 с.


### *Дадатковая*


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992 – 1995.
2. Баравікова, Р. А. Сад на капялюшыку каханай / Р. А. Баравікова. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1998. – 486 с.
3. Баравікова, Р. А. Слухаю сэрца / Р. А. Баравікова. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. — 96 с.
4. Барадулін, Р. Збор твораў: у 5 т. / Р. Барадулін. – Мінск.: Мастацкая літаратура, 1996 – 2003.
5. Бураўкін, Г. Выбраныя творы / Г. Бураўкін. – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 536 с.
6. Дранько-Майсюк, Л. В. Крыло: зборнік вершаў / Л. В. Дранько-Майсюк. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1984. – 197 с.
7. Дранько-Майсюк, Л. В. Над пляцам / Л. В. Дранько-Майсюк.. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1986. – 86 с.
8. Караткевіч, У. Збор твораў: у 25 т. / У. Караткевіч. – Выданне працягваецца. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2012 – .
9. Колас, Якуб Збор твораў: у 20 т. / Якуб Колас. – Выданне працягваецца. – Мінск: Беларус. навука, 2007 – .
10. Купала, Янка Поўны збор твораў: у 9 т. / Янка Купала. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1995 – 2003.
11. Янішчыц, Я. І. Каліна зімы: кніга лірыкі / Я. І. Янішчыц. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1987 – 205 с.


### *Электронныя носьбіты*


1. Алесь Камоцкі “Зорка спагады” (1999), “Віно дажджоў” (2002).
2. ВІА “Белорусские песняры” “Живём!” (2004).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Гурт “Ilo & Friends” “Сланечнікі” (2012), “Кола” (2016).
4. Зміцер Вайцюшкевіч “Цацачная крама” (2001), “Паравоз кахання” (2004), “Танга з ружай” (2006).
5. Лявон Вольскі “Белая яблыня грому” (2010).
6. Таццяна Беланогая “Матылёк” (2016).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Характарыстыка рэкамендаваных метадаў выкладання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

- гісторыка-тэматычны падыход;
- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, дыялогі, абмен думкамі і інш.);
- метад-аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарытоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы. У практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ Ў МУЗЫЧНЫМ УВАСАБЛЕННІ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей
1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках)
1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар ______________
Тэхнічны рэдактар __________________

Падпісана ў друк 2017. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. 1,31. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.